Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

4 СТУДЗЕНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 1 (27366) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НАВАГОДНІ ЗВАРОТ

ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АЛЯКСАНДРА РЫГОРАВІЧА ЛУКАШЭНКІ ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Фота БЕЛТА.

Дарагія сябры!

Мы такія рознія, але імгненні адыходзячага года робяць нас падобнымі, таму што мы аб'яднаны пачуццём урачыстасці і велічы гэтага моманту.

Літаральна праз некалькі хвілін нам давядзецца адправіць у архіў гісторыі высакосны 2012 год.

Помніце, роўна год таму мы сустракалі яго насцярожана і з апасеннямі. Але яны аказаліся дарэмнымі. Мы яго пражылі спакойна, упэўнена ідучы ўласным шляхам. Жылі сваім розумам, працай здабываючы хлеб надзённы. Мы нікога не пераймалі, не капіравалі бяздумна чужыя мадэлі. Не крыўдзілі іншых і не стваралі праблем для нашых суседзяў.

Мы нямала перажылі, праз многае прайшлі. Але заўсёды — разам! Пацвярджаючы непарыўныя духоўныя сувязі і з'яднанасць адзінай сям'і — беларускай нацыі.

У адыходзячым годзе мы нямала зрабілі для развіцця нашай краіны. Сабралі небывалы ўраджай збожжа. Сталі касмічнай дзяржавай і замахнуліся на будаўніцтва ўласнай атамнай электрастанцыі.

Узнялі на новы ўзровень ахову здароўя, адукацыю. Адраджалі сусветна вядомыя помнікі культурнай спадчыны.

Нашы студэнты, школьнікі, артысты і нават спартсмены праславілі Беларусь сваімі перамогамі на сусветнай арэне.

Але галоўным было тое, што Беларусь стала на 115 тысяч маленькіх грамадзян багацейшая. Гэта прыкладна на 6,5 тысячы больш, чым у мінулым годзе.

Кажу прыкладна таму, што, можа, у гэтыя імгненні адыходзячага года хтосьці стаў шчаслівейшы за нас, пачуўшы чароўны голас малюткі.

Я схіляюся перад вамі, што падарылі краіне будучыню — дзяцей. Яны — аснова нашай незалежнасці, дабрабыту і працвітання. І грамадства павінна зрабіць усё неабходнае для таго, каб захаваць гэты вялікі здабытак, зберагчы кожнае дзіця ад нягод і няшчасцяў.

У Год беражлівасці мы абавязаны навучыцца берагчы адзін аднаго. Не праходзіць міма чужой бяды, быць дабрэйшымі і больш уважлівымі да людзей, якія жывуць побач.

Наступны год стане пераломным для эканомікі. У нас няма іншага выбару: паколькі якаснае абнаўленне і паскораная мадэрнізацыя прадпрыемстваў — залог умацавання нашай дзяржаўнасці і росту дабрабыту народа.

У 2013 годзе Беларусь узначаліць Садружнасць Незалежных Дзяржаў. Старшынства нашай краіны пройдзе пад знакам захавання прыроды. Гэта божы дар, і мы павінны навучыцца яго рацыянальна выкарыстоўваць і захаваць для будучых пакаленняў.

Зрабіць так, каб падараная лёсам родная зямля была любімым і ўтульным домам для кожнага яе жыхара.

Дарагія сябры!

Летапіс Айчыны ўяўляе сабой сплаў імён і лёсаў мільёнаў асоб.

Прайшоўшы шмат няпростых гістарычных дарог, мы заслужылі сваё права быць шчаслівымі.

Мы глядзім у будучыню з упэўненасцю. Мы ведаем, куды ісці і што рабіць. Мы верым у сябе і ў невычэрпныя сілы народа.

Мы вельмі багатыя. У нас ёсць мільёны ўмелых рук, таленавітых, разумных і мудрых людзей.

І мой навагодні тост — за нас, за беларускі народ!

За дзетак — тых, хто ўжо нарадзіўся або ў хуткім часе з'явіцца на свет. І за іх бацькоў!

За старых, чый жыццёвы вопыт служыць нам прыкладам і апорай!

За нашых жанчын — ласкавых і клапатлівых, любімых і любячых!

За людзей у пагонах, якія забяспечваюць мір і бяспеку на роднай зямлі!

За нашу беларускую інтэлігенцыю, якая стварае духоўныя багацці народа!

За рабочых і сялян, кіраўнікоў і спецыялістаў, якія прымнажаюць здабытак краіны!

Няхай застануцца ў адыходзячым годзе ўсе крыўды і смутак, а новы год падорыць вам шчасце і радасныя перамены ў лёсе!

Здароўя, міру і дабра вам!

З Новым годам!

31 снежня 2012 г.

АДСВЯТКАВАЛІ ШУМНА, АЛЕ СПАКОЙНА

Усяго ў навагодніх мерапрыемствах, якія шырока прайшлі ў першую ноч года па ўсёй краіне, узялі ўдзел больш за 440 тысяч чалавек. Такую лічбу агучыла прэс-служба Міністэрства ўнутраных спраў.

Фота БЕЛТА.

Жыхары гарадскога пасёлка Круглае Магілёўскай вобласці сустракаюць Новы год.

Толькі ў Мінску ў забаўляльных праграмах, прысвечаных сустрэчы Новага года, удзельнічала каля 95 тысяч жыхароў і гасцей сталіцы. У забеспячэнні аховы грамадскага парадку ў месцах правядзення навагодніх гулянняў былі задзейнічаны супрацоўнікі органаў унутраных спраў і ваенна-служачыя ўнутраных войск МУС. Дзякуючы гэтаму надзвычайных здарэнняў удалося пазбегнуць — свята прайшло спакойна.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СТЫХІЙНЫЯ БЕДСТВЫ АБЫШЛІСЯ СВЕТУ Ў 160 МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ ЗА ГОД

67% агульных страт і 90% застрахаваных — такі вынік катастроф у ЗША.

У першую чаргу гаворка ідзе пра ўраган «Сэндзі», страты ад якога склалі каля 25 мільярдаў долараў. Акрамя таго, ЗША моцна пацярпелі ад засухі гэтым летам і ад шматлікіх тарнада.

Чалавечых ахвяр ад прыродных катастроф у 2012 годзе было істотна менш, чым у сярэднім за апошнія дзесяць гадоў — 9,5 тысячы чалавек супраць 106 тысяч. У 2011 годзе, да прыкладу, ад стыхіі загінула 27200 чалавек.

МВФ ПАПРАКНУЎ ЛАТВІЮ Ў ПРАЗМЕРНАЙ ЭКАНОМІІ

Міжнародны валютны фонд раскрытыкаваў скарачэнне мінімальнага гарантаванага прыбытку (GMI) у Латвіі, адзначыўшы, што гэтая мера прынясе шкоду сістэме падтрымкі малазабяспечаных насельніцтва. Звычайна МВФ, насупраць, вітае меры эканоміі.

У МВФ адзначылі, што скарачэнне выдаткаў на сацыяльныя патрэбы павялічвае разрыў паміж прыбыткамі багатых і бедных грамадзян, спрыяе эміграцыі ў багацейшыя дзяржавы ЕС, а таксама тармозіць эканамічны рост краіны.

З 1 студзеня 2013 года ў Латвіі ўступіў у сілу закон, паводле якога дапамога GMI зменшылася з 40 латаў для дарослых і 45 латаў для дзяцей да 35 латаў (66,5 долара) для ўсіх. Улады краіны растлумачылі рашэнне тым, што зніжэнне дапамогі будзе стымуляваць грамадзян шукаць працу.

Меры эканоміі нароўні з паспяховымі выпускамі дзяржаблігацый дазволілі Рызе датэрмінова разлічыцца па крэдыце МВФ на суму ў 820 мільёнаў латаў (1,56 мільярда долараў). 20 снежня 2012 года Латвія вярнула апошнія 493 мільёны латаў.

ДЗЯРЖДЭПАРТАМЕНТУ ДАРУЧЫЛІ ДАМАГЧЫСЯ ЎСЫНАЎЛЕННЯ ДЗЯЦЕЙ З КНДР У ЗША

Дзярждэпартаменту ЗША даручылі распрацаваць стратэгію дзеянняў, якія дазволяць амерыканскім грамадзянам усынаўляць сірот з Паўночнай Карэі.

Супрацоўнікі Дзярждэпартамента павінны будуць аналіз дыпламатычныя і бюракратычныя перашкоды, якія не даюць магчымасці амерыканскім сем'ям усынаўляць дзяцей з КНДР. Пасля гэтага дыпламаты прадставяць Кангрэсу шляхі знішчэння гэтых бар'ераў.

Амерыканскія палітыкі адзначаюць, што паўночнакарэйскія дзеці з'яўляюцца адной з самых слабых і безабаронных груп. Унутры краіны дзецям, якія засталіся без бацькоў, часта не могуць забяспечыць добры догляд.

ISSN 1990 - 763X

2013 ГОД: ЯКІМ ЁН БУДЗЕ?

Вось і надышоў 2013-ы. Адгрымелі святочныя салюты і феерверкі, і паволі вяртаюцца будзённыя клопаты і справы. Што новага нас чакае ўжо зараз у паўсядзённым жыцці? Чытайце наш кароткі агляд.

З новай «мінімалкай» і зарплатай

З 1 студзеня гэтага года месячная мінімальная заработная плата ўстаноўлена ўрадам у памеры 1 млн 395 тыс. рублёў, гадзінная — 8 тыс. 340 рублёў.

Тарыфная стаўка першага разраду павышана да 240 тыс. рублёў (была 225 тыс. рублёў).

Новаўвядзенні ў сацыяльным абслугоўванні

Уступіла ў сілу новая рэдакцыя Закона Беларусі «Аб сацыяльным абслугоўванні», які быў прыняты 13 ліпеня 2012 года. Галоўная навацыя — увядзенне дзяржаўнага сацыяльнага заказу. Спецыялісты сцвярджаюць: дзякуючы гэтаму да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў будуць прыцягнуты юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, што дасць магчымасць павысіць даступнасць і палепшыць якасць сацыяльных паслуг.

Сярод іншых навінак — сацыяльны патранат (суправаджэнне грамадзян, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі), а таксама сацыяльна-рэабілітацыйныя паслугі. З'явіцца паслугі суправаджальнага пражывання. Дзякуючы ім дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, атрымаюць магчымасць сацыяльна-працоўнай адаптацыі, пашырэння сацыяльных сувязяў, а інваліды змогуць адаптавацца да ўмоў побыту і працоўнай дзейнасці, падрыхтавацца да самастойнага жыцця па-за інтэрнатам.

Бацькі дзіцяці-інваліда атрымаюць права на сацыяльную перадышку — вызваленне ад догляду дзіцяці на пэўны перыяд часу.

Дапамогу на дзяцей прывязалі да сярэдняй зарплаты

Запрацаваў новы спосаб разліку дапамогі па доглядзе дзіцяці да трох гадоў: зыходзячы з велічыні сярзднямесячнай заработнай платы работнікаў па краіне, а таксама ў залежнасці ад чарговасці нараджэння дзіцяці ў сям'і. Дапамога ўстаноўлена ў наступных памерах: 35% сярэднямесячнай зарплаты на першае дзіця, 40% — на другое і наступных, 45% — на дзіця-інваліда. Новую дапамогу мамы атрымаюць ужо ў лютым.

Змяніліся цэны на сотавую сувязь і інтэрнэт

З 1 студзеня ўступілі ў сілу змяненні і дапаўненні ў Падатковы кодэкс Беларусі (былі прыняты 26 кастрычніка 2012 года). Адменены льготы па ПДВ (падатак на дабаўленую вартасць) на паслугі сотавай сувязі для фізічных асоб. У сувязі з гэтым сотавыя аператары і інтэрнэт-правайдары павысілі свае тарыфы на 20%.

Банкаўскія крэдыты — без камісій

З 23 студзеня беларускія банкі перастануць спаганяць камісійныя і іншыя плацяжы за карыстанне крэдытам. Гэта звязана з тым, што з 22 студзеня 2013 уступае ў сілу норма Банкаўскага кодэкса, якая забараняе спагнанне банкамі такіх плацяжоў з кліента. Але дзеянне гэтай забароны будзе распаўсюджвацца на крэдытныя дагаворы, заключаныя з 22 студзеня 2013 года. На крэдытныя дагаворы, заключаныя па 21 студзеня 2013 года ўключна, гэтая норма распаўсюджвацца не будзе.

Развесціся можна і ў ЗАГСе

З 1 студзеня 2013 года пачала працаваць норма Кодэкса аб шлюбе і сям'і, накіраваная на спрашчэнне шлюбаразводнага працэсу. Цяпер паўнамоцтвы па скасаванні шлюбу па ўзаемнай згодзе мужа і жонкі, у якіх няма непаўналетніх дзяцей і спрэчак аб маёмасці, перададзены органам запісу актаў грамадзянскага стану (ЗАГС). Да ўступлення ў сілу гэтай нормы шлюбаразводныя працэсы ажыццяўляліся выключна праз суд.

Гаспадары здымных кватэр будуць плаціць большы падатак

Паводле адной з паправак Падатковага кодэкса, максімальныя межы ставак падаходнага падатку для фізічных асоб, якія здаюць у наём жылыя памяшканні, павялічваюцца на 22%. Канкрэтны памер ставак на 2013 год будзе ўстаноўлены аблвыканкамамі і Мінскім гарадскім Саветам дэпутатаў (пры гэтым будзе ўлічвацца катэгорыя населенага пункта, у якім здаецца жыллё).

«Чарніла» больш не будзе

З 1 студзеня ў нашай краіне спынена вытворчасць пладовых мацаваных ардынарных вінаў. У той жа час захавалася вытворчасць пладова-ягадных вінаў палепшанай якасці, а таксама вінаў марачнага класа.

Святлана БУСЬКО.

Фота БЕЛТА.

Пад бой курантаў новага 2013 года ў Віцебскім абласным клінічным радзільным доме ў 00.01 з'явіўся на свет новы грамадзянін Рэспублікі Беларусь. Дзяўчынку назвалі Палінай. Вага нованароджанай склала 2 кг 900 г, а рост — 53 см.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр КОСІНЕЦ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:

«Год беражлівасці пачаўся ў Віцебскай вобласці яшчэ ў 2012 годзе. Найважнейшымі задачамі для эканомікі рэгіёна з'яўляліся зніжэнне матэрыяльных рэсурсаў, энергазберажэнне. У гэтым годзе, аб'яўленым Годам беражлівасці, эканоміі рэсурсаў будзе нададзена яшчэ большая ўвага, таму што гэта станоўча адаб'ецца на ўсёй эканоміцы ў цэлым, і ў першую чаргу паўплывае на рост заработнай платы».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 3°
Віцебск	0°
Гомель	+ 2°
Гродна	+ 3°
Магілёў	+ 2°
Мінск	+ 2°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 4.01.2013 г.

Долар ЗША	8570,00	▲
Еўра	11270,00	▼
Рас. руб.	284,00	▲
Укр. грыўня	1065,92	▲

На Каляды падмарозіць

У бліжэйшыя суткі праз тэрыторыю Беларусі будзе рухацца атмасферны фронт з боку Балтыйскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

У суботу і нядзелю на тэрыторыю краіны завітае больш халоднае паветра са Скандынаўскага паўвострава. Прагназуецца, што 5 студзеня амаль паўсюдна, а ў нядзелю месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах галалёдзіца. Уначы на суботу стане ўжо ад 0 да мінус 5, а ўдзень — ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. Яшчэ халадней стане ў нядзелю.

Сяргей КУРКАЧ.

У Мірскім замку ўпершыню пройдуць калядныя балі

На касцюміраваных балях у інтэр'ерах XVII стагоддзя можна будзе пабываць 4, 5 і 6 студзеня. Так, 4 студзеня ў Партрэтнай зале адбудзецца сапраўдны венскі баль са 120-гадовымі традыцыямі. Тут будзе гучаць жывая інструментальная музыка, неапалітанскія напевы, выступяць оперныя спевакі, гасцей чакаюць свецкія гульні, танцавальная праграма з вальсам, паланэзам і інш.

БЕЛТА.

КАРОТКА

Беларусь і Расія ўзгаднілі пастаўкі нафты ў першым квартале 2013 года ў аб'ёме 5,75 млн тон.

Новая базавая арэндная велічыня будзе ўстаноўлена ў Беларусі з 1 красавіка 2013 года на аснове даных Белстата аб індэксе спажывецкіх цэн за 2012 год у параўнанні з 2011 годам. Цяпер базавая арэндная велічыня складае Br54 тыс., яна дзейнічае з 1 красавіка 2012 года.

Урад Рэспублікі Індыя прыняў рашэнне аб адмене візавага правіла, у адпаведнасці з якім замежныя грамадзяне, якія наведвалі Індыю па турыстычнай візе, маглі звярнуцца па новую турыстычную візу не раней, чым праз два месяцы пасля выезду з Індыі ў іншую краіну. Забарона была ўведзена пасля тэрактаў у горадзе Мумбаі (фінансавая сталіца Індыі) у 2008 годзе.

Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 снежня 2012 года склаў Br122,8 трлн і павялічыўся ў параўнанні з пачаткам 2012 года на Br6,5 трлн, або на 5,5 працэнта.

У Беларусі заработная плата работнікаў бюджэтнай сферы са студзеня павысіцца ў сярэднім на 6,7 працэнта.

Уладзімір Пуцін падпісаў указ аб прыёме ў грамадзянства Расійскай Федэрацыі Жэрара Дэпардзьё. Тэкст указа размешчаны на афіцыйным сайце кіраўніка расійскай дзяржавы.

Міністэрства аховы здароўя Беларусі павысіла цэны на лабараторныя даследаванні аналізаў. Раней максімальны кошт даследавання крыві, узятой з пальца, гэтай паслугі быў крыху большы за Br2,5 тыс., цяпер — Br4,1 тыс. Забор крыві з вены падаражэў да Br5,1 тыс. (раней — каля Br3,5 тыс.).

СЁННЯ Ў МІНСКУ СТАРТУЕ 9-ы КАЛЯДНЫ МІЖНАРОДНЫ ТУРНІР СЯРОД АМАТАРАЎ ХАКЕЯ НА ПРЫЗЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гэтым разам узнагароды міні-першынства аспрэчаць 8 каманд, якія падзялілі на два квартэты. Беларусь будзе прэзентаваць каманда Прэзідэнта. У групавым турніры гаспадары сустрэнуцца з аматарскімі зборнымі Чэхіі, Швейцарыі і Канады. Адметна, што гульні турніру прымуць тры пляцоўкі. І калі паядынкі групавой стадыі пройдуць у Палацы спорту і ў Лядовым палацы, фінал, матч за трэцяе месца адбудуцца на 15-тысячнай «Мінск-Арэне».

Відавочна, што ў чарговы раз аматары хакея будуць чакаць сустрэчу, якая штогод збірае шмат наведвальнікаў. Але ці здолеюць беларусы зноў сустрэцца з расіянамі, даведаемся ў фінальны дзень — 7 студзеня. А пакуль нагадаем, што апошні паядынак гэтых каманд на Калядным турніры летась скончыўся ўпэўненай перамогай Беларусі — 4:1, якая 6 разоў перамагала ў вышэйзгаданым першынстве. І толькі двойчы чэмпіёнамі станавіліся нашы ўсходнія суседзі.

Па словах старшыні Федэрацыі хакея Беларусі Яўгена Ворсіна, у параўнанні з папярэднім годам арганізатары турніру правялі ратацыю ўдзельнікаў, паколькі фармат і тэрміны спаборніцтваў не дазваляюць прыняць удзел у іх усім ахвотным. «Прыемна, калі такія знакавыя мерапрыемствы, якім, несумненна, з'яўляецца і наш міжнародны турнір, карыстаюцца вялікім поспехам. Сёлетні Калядны турнір стане ўжо дзявятым, але мы кожны год рыхтуемся да гэтага мерапрыемства так, як быццам праводзім яго ў першы раз. Загадзя звязваемся з усімі камандамі, бо ў сувязі з навагоднімі святамі ёсць нямала праблем са своечасовым прыбыццём удзельнікаў, з фарміраваннем саміх каманд. Хацелася б падзякаваць усім удзельнікам за тое, што ні адна з запрошаных каманд не адмовілася ад удзелу. Больш за тое, штогод ахвотных выступіць у калядным турніры становіцца больш.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ЗАМЕЖНЫХ ЛІДАРАЎ З НОВЫМ ГОДАМ І КАЛЯДАМІ

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

«Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка з нагоды Каляд і Новага, 2013 года накіраваў віншавальныя пасланні вышэйшаму кіраўніцтву Расійскай Федэрацыі, Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Кірылу, Прэзідэнту Рэспублікі Казахстан Нурсултану Назарбаеву, Прэзідэнту Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаву, Прэзідэнту Азербайджанскай Рэспублікі Ільхаму Аліеву, Прэзідэнту Украіны Віктару Януковічу і іншым кіраўнікам краін СНД, Еўропы, Азіі, Афрыкі, Блізкага Усходу і Лацінскай Амерыкі», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Віншаванні ад імя Прэзідэнта Беларусі таксама накіраваны кіраўнікам міжнародных арганізацый, расійскіх рэгіёнаў, вядомым палітычным і грамадскім дзеячам, прадстаўнікам дзелавых колаў.

«Прыемна адзначыць, што адыходзячы год быў для Беларусі і Расіі годам актыўнага палітычнага дыялогу і канструктыўнага ўзаемадзеяння ў рамках Саюзнай дзяржавы і Адзінай эканамічнай прасторы, — гаворыцца ў віншавальным пасланні Аляксандра Лукашэнкі Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Пуціну. — Перакананы, што ў надыходзячым годзе дзякуючы сумесным намаганням будуць рэалізаваны новыя маштабныя праекты, дасягнуты дамоўленасці па актуальных пытаннях двухбаковых адносін, што стане важкім укладам у развіццё інтэграцыі нашых краін, умацаванне дружбы і ўзаемаразумення паміж брацкімі народамі».

У віншаванні Нурсултану Назарбаеву Аляксандр Лукашэнка адзначыў высокі ўзровень узаемаразумення паміж дзвюма краінамі і актыўны характар беларуска-казахстанскага супрацоўніцтва. Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў упэўненасць, што 2013 год стане для Беларусі і Казахстана новым рэзультатыўным этапам на шляху развіцця стратэгічнага партнёрства ва ўсіх сферах.

У адрас Прэзідэнта Беларусі таксама паступаюць шматлікія навагоднія віншаванні ад замежных лідараў, кіраўніцтва міжнародных арганізацый, вядомых дзяржаўных, палітычных і грамадскіх дзеячаў.

«Перакананы, што ў 2013 годзе мы забяспечым далейшае паглыбленне канструктыўнага супрацоўніцтва і шматузроўневай інтэграцыі. «Гэта, несумненна, адпавядае карэнным інтарэсам брацкіх народаў нашых краін», — гаворыцца ў віншаванні Уладзіміра Пуціна, якое паступіла ў адрас Аляксандра Лукашэнкі.

СКАРАЧЭННЕ НА ЧВЭРЦЬ ДЗЯРЖАПАРАТУ НЕ ПАВІННА НАШКОДЗІЦЬ ДЗЯРЖАЎНАМУ КІРАВАННЮ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 студзеня правёў рабочую сустрэчу з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэем Кабяковым і сваім памочнікам Наталляй Пяткевіч, якія ўзначальваюць створаную ў кастрычніку 2012 года дзяржаўную камісію для выпрацоўкі прапаноў па аптымізацыі структуры, колькасці і функцый дзяржаўных органаў, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Камісіі, у якую таксама ўваходзіць шэраг кіраўнікоў дзяржорганаў, было даручана да 30 снежня мінулага года ўнесці Прэзідэнту адпаведныя прапановы. У час рабочай сустрэчы абмяркоўваліся папярэднія вынікі праводзімай работы, каб у далейшым можна было ўжо ў больш шырокім складзе вярнуцца да гэтых пытанняў і прыняць неабходныя рашэнні па скарачэнні апарату дзяржслужачых.

«Мы дамаўляліся, што гэта будзе як мінімум 25 працэнтаў. Такі час настаў. Калі мы гаворым аб дэбюракратызацыі, то, зразумела, трэба, каб чыноўнікаў было менш. Калі чыноўнікаў шмат, яны ўсё роўна знойдуць сабе магчымасць займацца нават тымі пытаннямі, якія нам не патрэбны і якія якраз уваходзяць у пералік таго бюракратызму, супраць якога мы з вамі змагаемся, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — З іншага боку, гэта не павінна быць толькі механічна. Таму што мы можам нанесці шкоду дзяржаўнаму кіраванню. Ёсць пэўныя сталыя законы, няхай яны суб'ектыўныя, але яны выпакутаваны людзьмі, і трэба выразна разумець, колькі ў арганізацыі павінна быць чалавек, каб яна эфектыўна працавала».

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што задача па скарачэнні на чвэрць апарату дзяржслужачых гэта толькі сярэдні паказчык: «Гэта не значыць, што мы павінны скарачыць дзяржслужачых там, дзе яны перш за ўсё патрэбны і дзе скарачаць ужо немагчыма». У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў райвыканкамы, якія і цяпер невялікія па колькасці, але на іх усё ў большай ступені пераносіцца цэнтр цяжару ў кіраванні тымі ці іншымі працэсамі на месцах. «Таму тут трэба быць больш акуратнымі і асцярожнымі. Але ў той жа час я атрымліваю (і гаварыў аб гэтым) інфармацыю, што некаторыя нашы мясцовыя кіраўнікі ператвараюцца ва ўдзельных князькоў. Вось гэта ўжо, напэўна, мала мае адносін да скарачэння колькасці дзяржслужачых, а да эфектыўнасці нашага кантролю за гэтымі структурамі, падраздзяленнямі і канкрэтнымі людзьмі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Я гэта буду мець на ўвазе ў сваёй рабоце, але вам непасрэдна трэба будзе гэтым займацца».

«Словам, давайце яшчэ раз паглядзім, дзе мы правільна падышлі да гэтага пытання (я атрымаў вашы прапановы і ў цэлым іх падтрымліваю), а дзе, можа, яшчэ трэба правесці дадатковыя кансультацыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Наконт магчымасці скарачэння нейкіх міністэрстваў або ведамстваў Прэзідэнт падкрэсліў, што ў вырашэнні такіх пытанняў не павінна быць спешкі і да гэтага працэсу трэба падыходзіць узважана: «Што датычыцца скарачэння асобных органаў, міністэрстваў, ведамстваў, шчыра кажучы, я не гатовы па гэтым напрамку прымаць рашэнне. Трэба яшчэ раз параіцца з урадам і іншымі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, згадаў аб прапанове скараціць Міністэрства гандлю. «Можа быць, калі зыходзіць з кабінетных, толькі рынкавых выкладак. Але, з іншага боку, што больш за ўсё хвалюе людзей сёння? Тыя праблемы, якія фарміруюцца ў сферы гандлю. Так, можа быць, нам Міністэрства гандлю, напрыклад, перанацэліць на вырашэнне канкрэтных задач, якія непакояць нашых людзей», — дапусціў Прэзідэнт.

Ёсць прапанова і па скарачэнні Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што «да гэтага ўжо не аднойчы падыходзілі», але менавіта ў гэтай сферы сёння больш за ўсё праблем, якія хвалююць насельніцтва.

«Таму давайце не будзем спяшацца сёння ў плане скарачэння гэтых арганізацый, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я яшчэ раз кажу: трэба нам у нейкай ступені адысці ад гэтых рынкавых тэарэтычных разважанняў, а выходзіць з канкрэтных задач і сітуацый, якія складаюцца ў нас у краіне, і калі міністэрствы працуюць неэфектыўна, у тым ліку названыя (я з вамі абсалютна тут згодны, яны сабе пакуль яшчэ і месца ў поўным аб'ёме не знаходзяць), ну дык трэба іх азадачыць так, каб яны вярцеліся, круціліся і вырашалі тыя праблемы, якія сёння хвалююць людзей».

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

Супрацоўнікі падраздзялення цэнтральнага апарату Камітэта дзяржаўнай бяспекі перадалі Мінскаму гарадскому цэнтру медыцынскай рэабілітацыі дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі салодкія падарункі і папоўнілі матэрыяльна-тэхнічную базу цэнтра неабходным абсталяваннем.

Камітэт падтрымлівае ўстанову шмат гадоў. На працягу мінулага года супрацоўнікі дапамагалі цэнтру ва ўладкаванні навакольнай тэрыторыі, прадастаўлялі транспарт для правядзення гаспадарчых работ, бралі ўдзел у суботніках.

Наогул прадстаўнікі афіцэрскіх сходаў, ветэранскіх і прафсаюзных арганізацый органаў дзяржбяспекі наведалі напярэдадні Новага года звыш дзясятка падшэфных дзіцячых устаноў краіны — Жабінкаўскі інтэрнат для дзяцей з парушэннем зроку, Багушэўскую санаторную школу хворых на туберкулёз, іншыя дзіцячыя дамы, школы, рэабілітацыйныя цэнтры.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ТОП-ПАДЗЕІ 2012

У канцы года заведзена падводзіць своеасаблівыя вынікі: што адбылося, ці спраўдзіліся надзеі, якія мэты былі дасягнуты? Так робіць, бадай, кожны з нас. Рэдакцыя вырашыла пайсці па тым жа шляху, толькі ў дачыненні да ўсёй краіны. Якія падзеі ў жыцці Беларусі сталі знакавымі ў 2012 годзе, што прыцягвала нашу ўвагу, што хвалявала, што радавала? «Звязда» прапануе сваю версію топ-падзей мінулага года.

КНІГА. Увесь 2012 год прайшоў пад знакам кнігі. Абвешчаны такім у мэтах павышэння яе ролі і значнасці, а таксама ў мэтах папулярызацыі чытання ў сучасным грамадстве і развіцця айчыннай літаратуры, ён прынёс шмат цікавых падзей і мерапрыемстваў. Тым больш што беларусы заўсёды з павагай ставіліся да друкаванага слова.

ІЛЬГОТЫ. Прадастаўленне студэнтам сталіцы права бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце выклікала ў свой час неадназначную рэакцыю ў грамадстве. Гарадскія ўлады тлумачылі свой крок жаданнем падтрымаць моладзь, якая вучыцца, у няпростай эканамічнай сітуацыі. Таму інфармацыя пра адмену гэтай прэферэнцыі выклікала не меншыя спрэчкі, хоць самімі студэнтамі была ўспрынята ў цэлым спакойна. «У сталіцы для маладых людзей існуе мноства спосабаў для падпрацоўкі ў вольны ад вучобы час» — такой была матывацыя гарадскіх уладаў на гэты раз. Балазе, адмена льготы не закранула вучняў агульнаадукацыйных школ — школьнікі, як і раней, маюць права бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце сталіцы.

АСАБІСТАЕ. Жыццё кожнага чалавека непарыўна звязана з жыццём краіны. А ў кожнага з нас бываюць асабістыя святы, якія нельга абмінуць. Для газеты «Звязда» сёлета такой датай стала 9 жніўня, калі найстарэйшае ў Беларусі штодзённае беларускамоўнае выданне адзначыла свой 95-гадовы юбілей.

ПРАВАЛ. Дванаццаць медалёў заваявалі беларускія спартсмены на XXX летніх Алімпійскіх гульнях у Лондане. Дакладней, гэта тое, што засталося ў «сухой рэшце» пасля ўсяго, што адбылося. Такі вынік стаў самым горшым за ўвесь час выступленняў Беларусі як самастойнай каманды. Нагадаем, на Алімпійскіх гульнях у Лондане перад спартсменамі была пастаўлена задача заваяваць 25 медалёў, у тым ліку пяць залатых. Па выніках галоўнага спартыўнага мерапрыемства чатырохгоддзя некаторыя чыноўнікі і функцыянеры ад спорту страцілі свае службовыя крэслы... Літаральна ў заключны дзень Алімпійскіх гульняў, перад афіцыйнай цырымоніяй закрыцця, крыху «падсалодзіла пілюлю» наша зборная па мастацкай гімнастыцы, якая паклала апошнюю ўзнагароду ў агульную «скарбонку». Яна заняла другое месца ў групавых практыкаваннях, саступіўшы расіянкам.

ВЫБАРЫ. Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у складзе 110 дэпутатаў выбіраецца на чатыры гады. Сёлета 109 дэпутатаў былі абраны ў першым туры. Яўка выбаршчыкаў склала больш за 74 працэнты.

БАЛЬ. Палацавы баль упершыню прайшоў у нядаўна адкрытым пасля рэстаўрацыі Нясвіжскім палацы. Новы праект ініцыявала Міністэрства культуры. У яго аснове — ідэя адраджэння старажытнай традыцыі правядзення баляў. Праект практычна цалкам быў рэалізаваны за кошт спонсараў і мецэнатаў. На гэтае мерапрыемства былі запрошаны лепшыя айчынныя і замежныя калектывы, вядомыя персоны. У рамках палацавага балю ў Нясвіжы прайшла дабрачынная акцыя па зборы сродкаў на рэстаўрацыю помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны.

ПАДЗЕМКА. Мінскі метрапалітэн «прэзентаваў» гараджанам і гасцям сталіцы тры новыя станцыі: «Грушаўку», «Міхалова» і «Пятроўшчыну». Пра значнасць падзеі гаворыць той факт, што ў адкрыцці новых станцый браў удзел кіраўнік краіны. Новы ўчастак мінскай падземкі злучыў паўднёвы захад сталіцы з цэнтрам. Працягласць яго склала больш за 5 кіламетраў. На станцыі «Грушаўка» бронзавая кампазіцыя ў выглядзе велізарнай грушы адразу стала папулярным месцам для фотасесій пасажыраў метро.

ПАМЯЦЬ. Вайна 1812 года не абышла бокам і Беларусь: тагачасныя землі, што 200 гадоў таму ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, сталі арэнай баявых дзеянняў. Кровапралітныя баі на іх доўжыліся з чэрвеня па снежань 1812 года. І ў радах Вялікай арміі Напалеона, і ў войску імператарскай Расіі змагаліся і гінулі дзясяткі тысяч ураджэнцаў гэтых мясцін. Таму невыпадкова, што ў Рэспубліцы Беларусь столькі помнікаў і памятных месцаў, звязаных з вайной 1812 года. І цалкам лагічна, што сёлета на самых розных узроўнях прайшлі разнастайныя памятныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да 200-годдзя тых падзей. Іх кульмінацыяй стала правядзенне міжнароднага мітынгу-рэквіема і арганізацыя рэканструкцыі бітвы на рацэ Бярэзіне.

ДАТА. ***Беларусь шырока адзначыла 130-годдзе з дня нарадзінаў класікаў беларускай літаратуры Якуба Коласа і Янкі Купалы. Больш за тое, святкаванне выйшла за межы нашай краіны: сёлета да яго далучыліся Расія, Украіна, Польшча, Літва, Эстонія. І гэта невыпадкова, бо двух народных паэтаў Беларусі можна па праве прылічыць да класікаў сусветнай літаратуры.***

КОСМАС. 22 ліпеня з касмадрома Байканур была запушчана ракета-носьбіт з беларускім спадарожнікам. Беларусь стала касмічнай дзяржавай. А 23 кастрычніка стартаваў касмічны карабель «Саюз ТМА-06М», камандзірам якога стаў Алег Навіцкі. Гэта наш зямляк, які нарадзіўся ў Чэрвені. Алег Навіцкі — трэці пасля Пятра Клімука і Уладзіміра Кавалёнка беларускі касманаўт. Ганарымся!

АБ'ЯДНАННЕ. Яшчэ адна навіна, якую можна залічыць у разрад асабістых: стварэнне выдавецкага дома «Звязда». У яго ўвайшла ўласна «Звязда», а таксама тыя выданні, якія знаходзіліся ў складзе рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва»: часопісы «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Вожык» і газета «ЛіМ». Выдавецкі дом «Звязда» стаў «першай ластаўкай» згодна са стратэгічным напрамкам структурных пераўтварэнняў у сферы СМІ. Стварэнне ў Беларусі медыяхолдынгаў і выдавецкіх дамоў заклікана павысіць канкурэнтаздольнасць сродкаў масавай інфармацыі.

12.12.12. Прыгожая «сіметрычная» дата — апошняя ў ланцужку за апошнія дванаццаць гадоў. Наступная такая ж прыгожая дата будзе толькі ў трэцім тысячагоддзі. Менавіта ў гэты дзень многія пары вырашылі зарэгістраваць свой шлюб, хаця вясельнага буму, які чакаўся, не адбылося.

НАРМАТЫЎ. У Беларусі прапануецца ўвесці нарматыў на спажыванне электраэнергіі на аднаго чалавека ў залежнасці ад таго, абсталяваны дом газавай ці электрычнай плітой. Гэты пэўны аб'ём грамадзяне будуць аплачваць па льготных тарыфах. За электраэнергію звыш нормы павінны будуць плаціць па іншых, больш высокіх тарыфах. Канчатковыя лічбы нарматываў яшчэ не агучаны. Паводле праведзенага самімі энергетыкамі апытання, а таксама абмеркавання гэтай навіны, большасць беларусаў — за паступовае павышэнне самых тарыфаў на электраэнергію. Але разам з тым грамадзяне не вельмі ўхваляюць ідэю ўвядзення нарматываў.

КАНЕЦ СВЕТУ. 21 снежня 2012 года, як быццам бы прадказвалі індзейцы мая, павінен быў стаць канцом усяго існага. Гэты дзень, дарэчы, як і ўсе папярэднія «канцы свету», мы разам паспяхова перажылі. За будзённымі справамі і клопатамі было неяк не да яго. Ды і, па праўдзе сказаць, напярадзе ж...

Сяргей СТАРЫНАЎ.

■ Акцэнты года з Вадзімам Гігіным

ГОД ВЫБАРАЎ, ІНТЭГРАЦЫІ І ЮБІЛЕЯЎ

У нас. Беларусы — памяркоўная спакойная нацыя, якая добра выконвае свой грамадзянскі абавязак. Менавіта такую выснову можна зрабіць, аналізуючы галоўную палітычную падзею зыходзячага года — парламенцкія выбары.

Нягледзячы на прадказанні скептыкаў і тых, хто наўмысна заклікаў да байкоту, выбары адбыліся. Сфарміраваны новы склад Нацыянальнага сходу. І тут можна пабачыць пэўную пераемнасць. Прыкладна пятая частка — з мінулага склікання, амаль трэцяя частка — жанчыны. Шмат дзяржаўных служачых, урачоў, настаўнікаў, сілавікоў. Ужо не першы раз беларусы аддаюць перавагу народным выбраннікам з такога сацыяльнага асяроддзя.

Можна было б зрабіць выснову пра палітычны кансерватызм, які канчаткова перамог у Беларусі, калі б не іншая важная тэндэнцыя айчыннага палітычнага жыцця — мадэрнізацыя. Упершыню пра яе Аляксандр Лукашэнка загаварыў яшчэ ў самым пачатку года і потым неаднойчы ўзгадваў у розным кантэксце. У чым жа канкрэтна праяўляюцца мадэрнізацыйныя рысы ў беларускай палітыцы? Як гэта ні дзіўна, у павышэнні ролі партый. Так, нават на фоне таго, што ў парламент трапілі ўсяго 5 партыйцаў. Аднак, калі глядзець на астатнюю выбарчую статыстыку (колькасць членаў партый, якія патрапілі ў выбарчыя камісіі, сталі назіральнікамі, увайшлі ў каманды кандыдатаў), то тут відавочны прагрэс: лічбы ўзраслі ў разы. Варта ўзгадаць і вельмі знакавую сустрэчу Прэзідэнта з новым кіраўніком Камуністычнай партыі Ігарам Карпенкам. Нельга абысці ўвагай відавочна ўзрастаючую палітычную ролю пакуль яшчэ грамадскага аб'яднання, але з вельмі акрэсленымі партыйнымі амбіцыямі, «Белая Русь», якая, дарэчы, мае ў парламенце 63 сваіх прадстаўнікоў.

Яшчэ адна рыса мадэрнізацыі — стаўка на новае пакаленне кіраўнікоў. Пра гэта таксама ясна сказаў Прэзідэнт: у бліжэйшы час трэба прывесці ва ўладу дзеячаў ва ўзросце паміж 40 і 50 гадамі, якія забяспечаць пераемнасць і стабільнасць пры адначасовым развіцці беларускай палітычнай сістэмы. Таму можна прадказаць ужо зараз, што палітычнага міжсезоння ў Беларусі не будзе. Тыя працэсы і змены, якія вызначыліся ў 2012-м, працягнуцца і ў наступным годзе.

Вакол нас. Інтэграцыя — галоўнае слова, якое вызначае ў апошні час не толькі знешнюю палітыку Беларусі, але, увогуле, усе працэсы, што адбываюцца на постсавецкай прасторы. Дакладней, нічога прарыўнага ў 2012-м не адбылося, але сталі праяўляцца наступствы тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты раней. І, што важна, яны сталі прыносіць свой плён.

З 1 студзеня запрацавала Адзіная эканамічная прастора паміж Расіяй, Беларуссю і Казахстанам. Гэта значыць, што сталі паўнавартасна дзейнічаць чатыры свабоды, якія палягаюць у аснове нашай інтэграцыі: перасоўвання тавараў, паслуг, рабочай сілы і капіталу. Стаў дзейсным ужо другі этап (пасля Мытнага саюза) моцнай інтэграцыйнай хвалі, якая распачалася яшчэ пару гадоў таму. Наступным крокам будзе старт Еўразійскага эканамічнага саюза ў 2015 годзе.

Безумоўна, да станоўчых наступстваў інтэграцыі трэба аднесці пачатак будаўніцтва Беларускай АЭС з удзелам расійскага боку. Гэты буйны інвестыцыйны праект дазволіць цалкам вырашыць энергетычныя праблемы Беларусі, а таксама дасць моцны штуршок да развіцця паўночна-заходняга рэгіёна нашай краіны.

Важным дасягненнем з'яўляецца пераход да Беларусі старшынства ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Такое рашэнне было прынята на лістападаўскай нарадзе кіраўнікоў краін — членаў СНД у Ашхабадзе. Як гэта і адбывалася ўсе апошнія гады, наша краіна знаходзіцца ў авангардзе тых працэсаў, што вядуць да палітычнага, эканамічнага і гуманітарнага збліжэння народаў, якія складалі некалі адзіную дзяржаву.

Менавіта такая роля Беларусі і стае прычынай вельмі негатыўных адносін да яе з боку Захаду. Тое стала канчаткова відавочным пасля апошніх заяў дзяржсакратара ЗША Хілары Клінтан. Яна вызначыла інтэграцыю на постсавецкай прасторы ў якасці адной з галоўных небяспек, якія клапоцяць Вашынгтон. Але наўрад ці негатыўная пазіцыя Злучаных Штатаў здольная запаволіць тэндэнцыю да збліжэння і кааперацыі, што адпавядае нацыянальным інтарэсам тых дзяржаў, якія ў ёй удзельнічаюць.

З гісторыі. 2012-ы стаў годам вялікіх юбілеяў. Літаратурных: 130 гадоў з дня нараджэння «зорак» першай велічыні айчыннага пісьменства: Янкі Купалы і Якуба Коласа; 100 гадоў з дня нараджэння Максіма Танка, аднаго з самых палымяных і незвычайных беларускіх паэтаў XX стагоддзя. А таксама дзяржаўна-гістарычныя юбілеі: 1150-годдзе Полацка і 200-годдзе Айчыннай вайны 1812-га.

Трэба сказаць, што ад святкавання літаратурных юбілеяў засталося нейкае падвоенае ўражанне. З аднаго боку, не забыліся, ушанавалі, сказалі патрэбныя словы, арганізавалі конкурсы. Адным словам, правялі пэўную працу, выканалі план. І ўсё ж аддавала нейкім фармалізмам. У Мінску так і не з'явіўся помнік Максіму Танку, хаця даўно ўжо існуе вуліца, названая ў яго гонар, а сам паэт з'яўляўся ганаровым грамадзянінам сталіцы і нават доўгі час узначальваў Вярхоўны Савет БССР, гэта значыць, выконваў функцыі афіцыйнага кіраўніка дзяржавы.

Купалу і Коласа, наадварот, ужо так «заафіцыёзілі», зрабілі з іх такія іконы, што за імі часта і не разглядзець жывых людзей. Увогуле нам трэба рабіць вывады наконт таго, як мы адзначаем святы. Можа, трэба менш заарганізаванасці? Больш даверу да творчай ініцыятывы?

А вось гістарычныя юбілеі ўзрадавалі. Шмат дыскусій, розных пунктаў гледжання, іх адкрытае абмеркаванне на навуковых канферэнцыях і ў прэсе. Прычым гэтыя дыспуты не засталіся ў межах зацікаўленасці толькі спецыялістаў, але выйшлі на шырокую грамадскую прастору.

У большай ступені гэта тычыцца 200-гадовага юбілею вайны 1812 года. Першыя згадкі пра Полацк — больш сівая даўніна. Хаця таксама вельмі знакавая, бо напрамую звязана з заклікам Рурыка на княжанне на старажытнарускіх землях, а гэта значыць, і з заснаваннем агульнай дзяржавы, якая потым атрымае назву Кіеўскай Русі.

Ва ўсялякім выпадку, асабіста ў мяне складваецца ўражанне, што кожны такі юбілей — добрая нагода для нас, беларусаў, асэнсаваць сваё месца ў свеце, паглядзець на той гістарычны шлях, які прайшоў наш народ, пераадолеўшы нібыта масток у мінуўшчыну, да нашых продкаў. І погляд на сваю гісторыю павінен быць не памутнелы — шчыры і адкрыты. ■

■ Эканамічны лікбез

КУДЫ ЎКЛАСЦІ ГРОШЫ СЁЛЕТА?

У эканамічна неспакойныя часы людзі пачынаюць актыўна думаць аб тым, як захаваць свае грошы (калі яны, вядома, ёсць). Хоць мінулы год быў адносна стабільным, чэргі ў абменніках бачыў на свае вочы перад Новым годам. Народ усё роўна непакоіцца. «Звязда» звярнулася да тых, хто больш аб'ектыўна глядзіць на сітуацыю. Вось меркаванні некаторых экспертаў аб сёлетніх эканамічных перспектывах Беларусі.

«Можна і ў золата ўкладваць грошы, але гэта нізкаліквідны актыў. Вы ж яго шмат не купіце, ды і здаць пасля будзе праблематычна».

Сяргей ЧАЛЫ, эканамічны аналітык:

— Шчыра кажучы, я не думаю, што ў гэтым годзе павінна быць штосьці незвычайнае. Будзе прыкладна тое самае, што і летась. Інфляцыя будзе ніжэй — адпаведна, і стаўкі працэнтныя будуць ніжэй. А так, калі ніякіх памылак не будзе зроблена, значных змен не адбудзецца ў параўнанні з мінулым годам. Мы бачым, што ў 2012-м прымаліся разумныя рашэнні, таму павінна быць усё спакойна. Нейкай небяспекі, на мой погляд, няма.

Ірына НОВІКАВА, загадчык кафедры эканамічнай тэорыі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар эканамічных навук, прафесар:

— Сальда плацежнага балансу складваецца не вельмі добрае. Але ўрад атрымаў чацвёрты транш з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, а на пачатку года чакаюць новы транш. Гэтыя грошы паступяць у золатавалютныя рэзервы. Туды ж пойдзе і кітайскі крэдыт. Аднак, у той жа час, нас чакаюць вялікія выплаты па знешнім доўгу. Гэта праблема, але, на мой погляд, драматызаваць не трэба, гэта ўсё вырашальна. І курс рубля хоць і будзе трошкі змяншацца, гэта не стане катастрофай. Як прагназуецца, каля 9 тысяч за долар, я думаю, так і ўтрымае Нацбанк. Ва ўсялякім выпадку, у першым квартале. І зараз яшчэ шмат дэпазітаў менавіта ў беларускіх рублях, хоць і мяняюць некаторыя (як я кажу «слабанервовыя») рублі на валюту. Таму пакуль сітуацыяй можна кіраваць. Але на вельмі вялікі адрэзак часу рабіць дакладныя прагнозы складана.

Аляксандр ІВАШУЦІН, загадчык кафедры «Асновы бізнэсу» БНТУ, дацэнт, кандыдат эканамічных навук: «Не думаю, што трэба чагосьці баяцца. Курс долара відаць, будзе каля 9 тысяч. Галоўнае — каб з інфляцыяй справіліся. Ды і золатавалютных рэсурсаў пакуль хапае. Даць нейкую параду наконт таго, куды лепш за ўсё ўкласці грошы, складана. Думаю, што ў любым выпадку не прайграеш, калі адна частка зберажэнняў будзе ў рублях, другая — у доларах, а трэцяя — у еўра».

Пацікавіўся Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Веста-Борисов» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объекта недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская обл., г. Борисов, пр-т Революции, д. 17, в составе:

Лот № 1 – здание ресторана «Березина», инвентарный номер 610/С-12550, общей площадью 2618,6 кв.м.

Начальная цена с НДС – 6 921 191 520 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,4815 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на р/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **06.02.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 323. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.02.2013** до 12.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 39 47, (8029) 111 70 82.

ООО «Альстром»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, принадлежащего ООО «Альстром» со снижением цены на 20%

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота, без НДС, руб.	Задаток 10%, без НДС, руб.
1	2	3	4
1	Здание склада с подвалом и разгрузочной площадкой, расположенное по адресу: Гомельская область, Буда-Кошелевский район, Узовский с/с, д. Уза, ул. Залинейная, д. 8, площадью 857,1 кв.м, расположенное на земельном участке, на праве постоянного пользования по адресу: Гомельская область, Буда-Кошелевский район, Узовский с/с, д. Уза, ул. Залинейная, д. 8, площадью 0,7359 га.	212 400 000	21 240 000

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Продавец: ООО «Альстром», г. Гомель, ул. Лепешинская, д. 7, к. 1.

Задаток перечисляется до 04.02.2013 г. (включительно), на р/с № 3012401184015 в ОАО «Приорбанк», код 749, УНН 490419074.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до 16.00. 04.02.2013 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Дата, время, место проведения открытого аукциона: 05.02.2013 года в 10.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: 8 0232 68 26 34 или тел. 8 029 767 88 05, факс 8 0232 68 25 50.

Дополнительная информация содержится на сайте www.disponent.by

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму спецыялісту аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Семянюк Ганне Алегаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку начальніка Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Заяц Іне Анатольеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

ПАНЯДЗЕЛАК, 7 СТУДЗЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.25 Існасць.
6.50 Слова Мітрапаліта Філарэта на Нараджэнне Хрыстова.
7.00 Добрай раніцы, Беларусь!
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.15 Анімацыйны фільм «Іван Царэвіч і Шэры Воўк».
10.50 Навагодні канцэрт з ВІА «Сіняя птушка».
12.20 Галоўная ёлка краіны. Навагодняе дабрачыннае свята для дзяцей з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
13.45 М/ф «Астэрыкс і вікінгі».
15.10 Навагодні канцэрт з Дзмітрыем Калдуном.
16.20 Мюзікл «Марозка».
18.15 Меладрама «Масква слязам не верыць».
21.35 Меладрама «Двайная суцэльная. Каханне».
23.20 «Калядны турнір па хакеі на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь». Дзённік.
23.45 Маст. фільм «Анёл-А».

АНТ

7.00 «Наша раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 Контуры.
10.05 «Навагодні смех».
10.50 Камедыя «Выпадковыя знаёмыя».
12.35 Маст. фільм «Зімовы раман».
14.05 «Хвіліна славы» крочыць па краіне». Фінал.
16.10 Маст. фільм «Навагодні пярэпалах».
19.40, 20.50 «Калядныя сустрэчы» Алы Пугачовай.
22.50 Маст. фільм «Раман з каменем».
0.40 Камедыя «Кабінетны гарнітур».

БЕЛАРУСЬ 2

7.20 Меладрама «Снежнае каханне, або Сон у зімовую ноч»
9.25, 20.55 Тэлебарометр.
9.30 Камедыя «Дзяўчаты».
11.20 Навіны надвор'я.
11.50, 21.05 Жаночая ліга.
12.20 Школа рамонту.
13.25 Пад грыфам «Вядомыя».
14.00 Фільм-казка «Мэры Попінс, да пабачэння».
16.35, 23.35 Мюзікл «Снежная каралева».
18.30 Дак.фільм «Золата Грышына».
19.05 Маст. фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў».
21.00 КЕНО.
21.30 Камедыя «Зімовы раман».
23.10 Авертайм.

СТБ

6.10 «Спецыяльны праект»: «Новы год па-руску».
7.00 Маст. фільм «Калыханкі».
8.30 «Жанчыны XX стагоддзя». «Барбра Стрэйзанд. Смешная лэдзі з жалезным характарам».
9.00 «Тыдзень».
10.10 «Вялікае сненанне».
10.50 Маст. фільм «Крама цудаў».
12.40 «Такі лёс».
13.30 «Вялікі КВЗ».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Званая вячэра». Лепшае.
17.40 «Новы год у цырку».
20.00 Маст. фільм «Пяшчота».
22.00 «Песні на ўсе часы». Лепшае.

МІР

5.00 М/ф.
6.50 Маст. фільм «Фініст — Ясны Сокал».
8.15 «Экспериментатары».
8.30 «Любімыя акцёры. А. Янкоўскі».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 Маст. фільм «Сляпы закон».
12.10 «Сталіцы ў асобах».
12.40 Серыял «Вялікая гульня».
15.10 Серыял «Асабістае жыццё доктара Селіванавай».
17.00 Ток-шоу «Слова за слова».
18.10 «Практычная магія».
19.10 Серыял «Клан Кенэдзі».
20.30 Маст. фільм «Галубка».
22.30 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры».

3.00 Маст. фільм «Волга-Волга».

8 КАНАЛ

7.00, 11.40, 18.35, 21.00, 23.40 «Надвор'е».
7.05 «На рыбалку».
7.20, 15.00 Серыял «Клан Сапрана».
8.25, 14.35 Серыял «Незямны сёрфінг».
8.50, 17.30 Серыял «Мост».
9.55 «TUT woman tv».
10.10 Камедыя «Калядныя прыгоды сям'і Фоксаў».
11.45 Меладрама «Зорка чароўнага шчасця».
16.00 «Мультпарад».
16.15 «Мой любімы гадаванец».
16.45 Серыял «Пляткарка».
18.40 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Меладрама «Ганна і кароль».

ВТБ

6.00, 0.30 «PLAY».
8.00 «Дэкаратыўныя страсці».
8.30 «Нязоркавае дзяцінства».
9.00 «Жывыя гісторыі».
10.00 «Гарады свету».
10.30, 19.00, 23.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
11.00, 18.00, 21.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
12.00, 17.30, 22.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.00 «Згаслыя зоркі».
14.00 «Добрыя жарты».
16.00 «Уральскія пельмені».
20.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.00 «Людзі хэ».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Серыял «Клубнічны рай».
10.20, 11.20 Серыял «Чужыя мары».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
12.35 Камедыя «Крок насустрач».
